# 80 гадоў Анатолю Грыцкевічу



**ГРЫЦКЕВІЧ** Анатоль Пятровіч (н. 31.1.1929, Менск), беларускі гісторык. Доктар гіст. н. (1986), праф. (1987). Скончыў Менскі дзярж. мед. ін-т (1950) і дзярж. пед. ін-т замежных моў (1955), БДУ (1958). Працаваў урачом. З 1959 у Ін-це гісторыі АН БССР, з 1975 заг. кафедры Менскага ін-та культуры (з 1993 Бел. ун-т культуры). Даследуе гісторыю Беларусі перыяду феадалізму, прыватнаўладальніцкія гарады (вызначыў іх колькасць і тыпы, узровень эканам. развіцця, сістэму кіравання і самакіравання, ролю іх як вайсковай апоры, сац.-эканам. становішча мяшчанства), гістарыяграфію. Аўтар публікацый па гісторыі шляхецкага саслоўя, генеалогіі шляхты і выбранцаў. Вывучае рэліг. праблемы ў ВКЛ, становішча правасл. царквы, уніяцтва. Даследуе гісторыю ваен. і дыпламатычных узаемаадносін Літвы і Сав. Расіі, літ.-бел. дачыненняў у 1919—20. Аўтар гіст. нарысаў пра Слуцк, даследаванняў пра Слуцкае паўстанне 1920 года.

Сябар рады ТБМ на працягу многіх гадоў.

Анатоль Пятровіч з'яўляецца правадзейным сябрам Міжнароднай Акадэміі Еўразіі, абіраўся на пасаду старшыні Згуртавання Беларусаў свету "Бацькаўшчына". А.П. Грыцкевіч у 2008 годзе быў адзначаны ўзнагародай часопіса „Przeglad Wschodni" імя Аляксандра Гейштара, якая штогод уручаецца навукоўцам за пашырэнне ведаў пра гісторыю Усходняй Еўропы.

Сакратарыят ТБМ, рэдакцыя газеты "Наша слова" шчыра віншуюць найактыўнейшага змагара за Беларускасць Анатоля Пятровіча Грыцкевіча з 80-годдзем і зычаць яму моцнага здароўя і сілаў дзеля Беларусі.

*(Інтэрвію з А.П. Грыцкевічам чыт. на ст.2.)*

